598.qxd 11/25/2015 1:21 AM Page 1 (3,1)

Вескі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

Viestki j Paviedamleńni

Сусьветнае сеціва: ***e-krama.com, pahonia.com***
Электронны адрас: ***viestki@mail.com***
P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735

№ 12 (598)
Сьнежань 2015 г.

Эпоха таксама

Такая ў нас спэцыфіка, спадарства, шанцуе ў няўдачы і не шанцуе ў посьпеху. Чакалі-чакалі запаветнага Нобэля і дачакаліся.

Нобэль міру для Абамы і літаратурны Нобэль для Алексіевіч – цяжка сьцьвярджаць, што ў гэтым няма сваёй лёгікі. Сьвет постмадэрнізму, сымбалічны адлік якога пачынаецца з ушанаваньня апошняга мадэрніста Сэмюэла Бэкета, кіруецца сваёй пасьлядоўнай лёгікай, лева – гэта права, права – лева, палітычны хэпэнінг – гэта таксама тэатар, інсталяцыя – гэта таксама мастацтва, урэшце, журналістыка – гэта таксама літаратура. У эпоху, калі інструкцыя для абслугі і апавяданьне – гэта ўсё проста тэкст, аўтар памёр, гісторыі прыйшоў канец, а пол вызначаецца сьвядомасьцю, дзівіцца таму, што журналістыка – гэта таксама літаратура, як і таму, што вайна – гэта мір, проста не выпадае.

Першай пра прысуджэньне Нобэлеўскай узнагароды даведалася партнэрка Сэмюэла Бэкета, Сюзан. На гэтую навіну яна адрэагавала словам “катастрофа”. Трэба заўважыць, што беларускае грамадзтва, адрэагавала з нашмат большым энтузіязмам. “Першы беларускі Нобэль”, “Свой пасад між народамі”, “Увесь сьвет даведаўся пра Беларусь”. Першы халодны душ, праўда, прыйшоў адразу поруч з радаснай навіной – “is awarded to the Bela...russian writer Svetlana Alexievich”. Ці магчыма такое, каб навукоўцы швэдзкай акадэміі, якія афіцыйна аб’яўляюць пра прызнаньне ўзнагароды на швэдзкай, ангельскай, французкай і нямецкай мовах, ня ведалі пра такую фанэтычную дробязь? Ці можа, наадварот, прафэсары ні ў чым не памыліліся, як і тады, калі загадчыкі менскай кнігарні на наступны дзень напісалі: “Лауреатом Нобелевской премии по литературе в 2015 году стала советская и белорусская писательница Светлана Алексиевич”.

У 2004 годзе адзін з чальцоў швэдзкай акадэміі, Кнут Ахнлунд, пакінуў камітэт пасьля прызначэньня ўзнагароды аўстрыячцы Елінэк, матывуючы свой сыход наступным: „Гэта непапраўнае шкодніцтва ўсім прагрэсіўным сілам і блытаньне агульнага разуменьня літаратуры як мастацтва...”, а творы Елінэк акрэсьліў, як “перамяшаную масу тэкстаў без мастацкай структуры”. У сёлетнім Нобэлеўскім камітэце нікога пакрою Ахнлунда не знайшлося. Таму што ў наш час журналістыка – гэта таксама літаратура, рэпартаж – гэта таксама мастацтва, інтэрвію – гэта таксама творчасьць.

У дзеяньнях і матывах Нобэлеўскага камітэту не было б нічога дэмаралізуючага, калі б гэта не было вадою на млын прыхільнікаў “прагрэсіўнага” разуменьня таго, чым зьяўляецца беларуская літаратура. Цяпер, згодна з іхнай лініяй, ужо з нашмат большай упэўненасьцю можна з гонарам сьведчыць, што беларуская літаратура гэта таксама літаратура на расейскай мове, зьвязаная зь Беларусьсю шырокім кантэкстам, а беларускі пісьменьнік таксама той, які сам сябе, або ў крайнім выпадку іншымі, нейкім чынам адносіць да гэтага шырокага кантэксту. Сама Алексіевіч на вестку аб уручэньні ёй Нобэля прасьпявала менавіта ў гэтым ключы: „Я чалавек беларускага сьвету”. Нічога больш дадаць і немагчыма, паколькі іншых, клясычных у сваім вызначэньні, пунктаў суаднясеньня фактычна няма.

Магчыма, па-за шэрагам атак на беларускі нацыяналізм і беларускую мову, як у гутарцы зь нямецкім “Frankfurter Allgemeine Zeitung”, калі Алексіевіч заявіла: “Я пишу только по-русски и также считаю себя представительницей русской культуры. Белорусский язык очень крестьянский и литературно недозрелый”. Трохі пазьней, прыпёртая да сьцяны Алексіевіч сказала, што яе няправільна зразумелі журналісты выданьня. І ўсё ж, неяк у гэта ня верыцца. Па-першае, вельмі падобныя фармулёўкі можна пачуць ад Алексіевіч ледзь не на кожнай замежнай прэзэнтацыі яе творчасьці, калі заходзіць дражлівая для аўтаркі гаворка пра беларускасьць. Па-другое, звычайна, калі чалавек хоча ачысьціцца ад такіх сур’ёзных закідаў, то падае на выданьне, якое перакруціла ягоныя словы, у суд.

У пазабеларускім кантэксьце Алексіевіч летапісец чырвонай эпохі і біёграф чырвонага чалавека. У нейкім сэнсе хутчэй нават аўтабіёграф, што толькі ўзмацняе эфэкт ад мэталітаратурнай дзейнасьці Алексіевіч, якая сама сябе называе таксама савецкім чалавекам. Алексіевіч адначасна і хронік чырвонай эпохі і яе рэ-

заканчэньне на бачыне 3

Запрашаем на прэзэнтацыю


літаратурнага альманаха беларускіх пісьменьнікаў замежжа **“БЕЛАРУС”,** якая адбудзецца ў суботу **26-га сьнежня 2015 году** на Мангэтане ў Доме Маракоў па адрасу:

123 East 15th Street
New York, NY 10003.

На імпрэзе будуць прысутнічаць выдаўцы і шмат хто з аўтараў выданьня. Прысутныя змогуць пазнаёміцца зь імі, задаць пытаньні, атрымаць аўтографы і набыць новы нумар альманаха па зьніжанаму адмыслова для прэзэнтацыі кошту.

Сёлета ў нумары, ужо дзявятым па ліку ад часу заснаваньня, сабраныя творы 25 беларускіх літаратараў замежжа, што жывуць у 10 краінах сьвету.

Даведацца больш інфармацыі пра новы нумар і замовіць яго можна, наведаўшы ў сусьветным сеціве старонку **e-krama.com.**



Лістападаўскі сход Згуртаваньня "Пагоня"

У суботу, 14-га лістапада, у Доме Маракоў на Мангэтане прайшоў чарговы сход "Пагоні". Напачатку выступіў старшыня Згуртаваньня сп. Віталь Зайка. Ён зрабіў некалькі аб'яваў, у тым ліку пра сьвяткаваньне Дня Герояў – Слуцкага Збройнага Чыну 5-га сьнежня.

Затым ён прадставіў госьцю Анастасію Ільліну, доктара сацыялёгіі й стажорку ў Калюмбійскім унівэрсытэце, якая выступіла з гутаркаю пра беларускую нацыянальную сьведамсьць. Сп. Зайка адзначыў, што пры размове аб нацыянальнай тоеснасьці трэба дамовіцца пра тэрміны і знайсьці спачатку агульную глебу паразуменьня, а таксама пэўную ўнівэрсальную адзінку вымярэньня вартасьці, якой, на ягоную думку, ёсьць жыцьцё асобнага чалавека. Сп-ня Ільліна спачатку распавяла пра сябе. Яна родам зь Берасьця, ад падлеткавага ўзросту брала ўдзел у апазыцыйнай грамадзкай дзейнасьці, і таму ўлады не дазволілі ёй працягваць адукацыю ў Беларусі. Вучылася ў Польшчы, абараніла там дысэртацыю і цяпер працуе ў Інстытуце філязофіі й сацыялёгіі Польскай АН. Цяпер на стажы пры Калюмбійскім унівэрсытэце па праграме абароны правоў чалавека. Выступала з гутаркамі пра становішча ў Беларусі й рэжым Лукашэнкі.

Прамоўца коратка спынілася на бягучым моманце ў Беларусі і на тым, як брак нацыянальнай сьведамасьці ўплывае на ходу падзеяў. Істотнымі чыньнікамі таксама ёсьць брак палітычнай культуры і неразуменьне грамадзянскага доўгу. Усё гэта ёсьць складнікамі праблемы пад назваю "Гома саветыкус", што працягвае актыўна ўплываць на грамадзкую сьведамасьць і фармаваць постсавецкі сьветагляд. Тут вельмі істотнаю рысаю робіцца маніпуляваньне гістарычнай памяцьцю, і яно выдатна адлюстраванае ў творах Сьвятланы Алексіевіч. Праз усе творы Алексіевіч праходзіць цікавасьць аўтаркі да простага, "неславутага" чалавека, да ягонага жыцьця, пачуцьцяў, досьведу, спадзеваў. Тое, што захоўвае калектыўная народная памяць, амаль ніколі не пасуе афіцыйнай прапагандысцкай лініі, як колішняга савецкага рэжыму, так і цяперашніх рэжымаў у Беларусі й Расеі. Пачынаючы ад сваёй першай кнігі пра савецкіх жанчынаў на Другой сусьветнай вайне " У вайны не жаночае аблічча", Алексіевіч адчула ціск афіцыйных ідэалягічных ворганаў і сутыкнулася з патрабаваньнямі выкінуць або перарабіць часткі сваіх твораў. Затым яна была ў Аўганістане, напісала па выніках інтэрвію з савецкімі вайскоўцамі ды іхнымі блізкімі кнігу "Цынкавыя хлопчыкі". За гэтую кнігу некалькі сваякоў і ўдзельнікаў той вайны падалі на аўтарку у суд нібыта за скажэньне іхных словаў ды інфармацыі. Але ў выніку судовага разгляду, які, дарэчы, адбываўся ў незалежнай ужо Беларусі ў 1992-1993 гг., была прызнаная слушнасьць пазыцыі й тэкстаў С. Алексіевіч. Затым былі творы пра ахвяраў Чарнобылю, пра самагубцаў, пра дзяцей вайны і, нарэшце, як спроба падсумаваньня савецкага досьведу, кніга пра канец савецкага ладу і пачатак новага часу – "Час сэканд-хэнд". Сп-ня Ільліна прачытала ўступны разьдзел кнігі Алексіевіч "Час сэканд-хэнд".



Анастасія Ільліна

Затым да дыскусіі далучыліся прысутныя. Сярод іх быў і прадстаўнік Украіны з Данецку сп. Дмітро Палій. Ён адзначыў, што гадаваўся савецкім чалавекам і асабліва не цікавіўся ўкраінскай культурай, мовай, гісторыяй. Але вось прыйшлі падзеі зімы 2014 году, і ўсё памянялася. Людзі мусілі выбіраць, хто яны і з кім. І менавіта тады ён стаў украінцам, зрабіў свой выбар – хоць украінцамі былі ўсе ягоныя продкі. І гэта нялёгкі выбар, калі навокал зьбівалі і нават забівалі за тое, што назваўся ўкраінцам. Тут першым мусіць быць чалавекалюбства, спроба ўспрыняць бліжняга як чалавека, а тады ўжо як прыналежнага да нейкай групы, этнічнасьці. Але, нажаль, гэтыя прынцыпы чалавекалюбства адкідаюцца, як бачым, у Расеі, і Алексіевіч слушна асудзіла тую хуткую трансфармацыю расейскага грамадзтва, што адбылася за часы кіраваньня Пуціна і, асабліва, за апошнія два гады.

Сп. Зьміцер Левіт нагадаў пра адрознасьць сыстэмаў дзяржаўнасьці на Захадзе і ў ЗША ад той сыстэмы, што стварылі Лукашэнка і Пуцін. На Захадзе над усім стаіць выкананьне законаў, а там – воля, ці лепш, сваволя дыктатара.

Сп. Віталь Зайка адзначыў, што асноваю ўсяго ёсьць стаўленьне да індывіду, да чалавечай асобы – на Захадзе яна падваліна ўсяго дзяржаўнага і грамадзкага ладу, а на Ўсходзе яе зьневажаюць ды ігнаруюць на карысьць калектыву, дзяржаўнай машыны. Але вяртаючыся да Беларусі й Алексіевіч, варта адзначыць, што пісьменьніца знаходзілася ў пошуку ды пры гэтым, нажаль, нацыянальная тоеснасьць – гэта тое, што цікавіла яе менш за іншыя чалавечыя атрыбуты й якасьці. Інтэграцыйная на словах савецкая сыстэма выгадавала людзей па няпісаных правілах таго, што расейскія мова й культура ёсьць найвышэйшыя і найвыкшталцоныя, а іншым культурам заставалася дэкаратыўнае, другаснае і несур'ёзнае месца. І творчасьць Алексіевіч нясе рысы такога ўзгадаваньня.

Сп. Левіт дадаў, што калі беларусы былі людзямі другога гатунку, дык гэбраі – яшчэ горшага, трэцяга гатунку. Сп-ня А. Ільліна у гэтай сувязі ўзгадала тэрмін "калёнія" і стаўленьне да чужынца як лякмусавую паперку слушнасьці міжчалавечых адносінаў.

Сп. Алег Іваноў узгадаў сваю вучобу ў Навасібірскай акульнавайсковай вучэльні ў канцы 1980-х, калі выпускнікоў меркавалі накіраваць у Аўганістан, і людзі сапраўды ірваліся ехаць туды. Між іншага, кніга Алексіевіч "Цынкавыя хлопчыкі" выкарыстоўвалася тады на занятках спэцкурсу па пераадоленьні страху пры вайсковых дзеяньнях.

Сп-ня Ільліна заўважыла, што, на яе думку, страх ёсьць нацыянальнаю рысаю беларуса, і што беларусы не змагаюцца са страхам. Сп. Сяржук Сокалаў-Воюш адзначыў, што можа менавіта страх дапамог беларусу захавацца, выжыць, тады як адвага і ахвярнасьць некаторых іншых народаў дорага каштавалі ім. Але гэта зусім ня значыць, што сярод беларусаў не было людзей адважных і ахвярных. Але каб перастаць баяцца, трэба пачаць нешта рабіць для грамадства.

Сп-ня Ільліна адзначыла, што на стаўленьне Алксіевіч да беларускасьці паўплывала яе грамадзянская пазыцыя, якая не магла не прызнаць уціску і дыскрымінацыі беларускай мовы. Сп. Сокалаў-Воюш згадаў пісьменьніка Кастуся Тарасава, які быў расейскамоўным і стварыў значныя творы для беларус-

заканчэньне на бачыне 3

598.qxd 11/25/2015 1:21 AM Page 3 (3,1)

Якога колеру сьцяг Алексіевіч на літаратурным Эвэрэсьце

8 кастрычніка 2015 году, дзень калі Сьвятлана Алексіевіч, прадстаўніца Беларусі, была абвешчаная Нобэлеўскай ляўрэаткай, безумоўна, значны дзень для гісторыі, і ня толькі літаратурнай. Адшумелі ў сеціве першыя спрэчкі пра беларускасьць Нобэлеўскай прэміі Алексіевіч. Калі прагледзець усе творы пісьменьніцы (або журналісткі), перш кідаецца ў вочы цікавасьць да досьведу звычайнага, “маленькага” чалавека. Але разам з гэтым кнігі Алексіевіч – шматтомная анталёгія экасыстэмы саўка. Гэта своеасаблівая элегія і рапсодыя патэрналісцкаму, паўазіяцкаму, калектывісцкаму грамадзтву, якое пачало разбурацца ў позьні свой пэрыяд, а пасьля было фармальна пахаванае ў Белавежы ў 1991 годзе. На вялікі жаль, савок ня цалкам выпусьціў тады дух і, як зомбі, адваёўвае сабе цяпер душы і целы, а таксама тэрыторыі.

Фармальна незалежная Беларусь зрабілася полем русіфікацыі й вынішчэньня рэштаў беларускай культуры, беларускай этнічнай прысутнасьці. Гэта адбываецца пад старшынствам “беларускага” прэзыдэнта, з удзелам “беларускіх” мэдыяў, “беларускай” праваслаўнай царквы і пад абаронаю “беларускіх” КГБ, міліцыі, войска. І Лукашэнка тут – не прычына, але ўсяго толькі сымптом. Алексіевіч, засяроджваючыся на прыватных, лякальных трагедыях паасобных людзей, не здае сабе справы, што паміж трагедыямі асобаў і трагедыяй нацыі, якая збольшага застаецца па-за ейнай пісьменьніцкай увагай, існуе самая непасрэдная сувязь. Што менавіта неразуменьне свайго месца і прызначэньня ў сьвеце, брак тоеснасьці, адчуваньня прыналежнасьці да пэўнай супольнасьці, да нацыі на гэтай зямлі і ёсьць незаўважаны, але вырашальны чыньнік асабістых трагедыяў беларускіх людзей.

Нажаль, інтымная знаёмасьць Алексіевіч зь беларускай “глыбінкай” не пераходзіць у дадатную якасьць, а поўніць яе адно толькі сумам і роспаччу. Жыцьцядайная сіла, адчуваньне мэты і сэнсу, якія надаюць сёньня жывучым тыя адыйшоўшыя пакаленьні ў выглядзе Гісторыі, зусім не зачапілі набэлёўку, не пакінулі сьледу ў яе творчасьці. Хоць напісаныя або запісаныя часьцяком на матэрыяле гістарычным, творы Алексіевіч пазбаўленыя гістарычнай пэрспэктывы, гістарычнага кантэксту. І гэта тое, што робіць яе творы шмат у чым павярхоўнымі, характары – не да канца зразумелымі, а самую аўтарку ці рэдактарку – не належачай да беларускага сучаснага краявіду.

І гэта ня значыць, што аўтар гэтых радкоў лічыць Алексіевіч няшчырай, хоць некаторыя ейныя выказваньні пра беларускія нацыянальныя сілы ёсьць непрыхаваная і ганебная дэфамацыя. Дапушчаю, што Алексіевіч сьвята верыць у тое, што калі Пазьняк і не сказаў таго, што яна ўкладала ў ягоныя вусны, дык мог сказаць. Дэманізацыя беларускіх нацыянальных сілаў, мэтадычнае вынішчэньне беларускасьці ў Беларусі – зьява, якой Алексіевіч наўмысна і ўпарта ня бачыць. Але гэтая зьява тым ня менш займае цэнтральнае месца ў той прасторы, дзе існуюць героі ці інфарманты Алексіевіч. Аплакваючы нядолю падданых былой савецкай імпэрыі, Алексіевіч тым самым аплаквае і самую тую імпэрыю, той паўазіяцкі сьветагляд, прамежкавую, недаробленую форму грамадзкага ладу, той гной і бруд, што можа калі й стануць харчуючай глебай наступных грамадзкіх фармацыяў, але якія пахавалі пад сабою тыя рэшты беларускіх нацыянальных рысаў, для якіх не знайшлося месца ў творах Алексіевіч.

Забойчая, генацыдальная якасьць саўка ссоўваецца ў спасылкі, на маргінэс, пакідаючы яго не палітсыстэмай, але экасыстэмай, якая стаіць па-над паасобнымі дзяржавамі-спаткаемцамі. І гэта робіць Сьвятлану Алексіевіч пісьменьніцай без “нацыянальнай прапіскі” (што яе, напэўна, і цешыць), робячы актуальнымі спрэчкі пра яе нацыянальнасьць. Абнадзейваюць толькі нядаўнія заявы ляўрэаткі пра Беларусь і яе спасылкі на Алеся Адамовіча і Васіля Быкава як сваіх настаўнікаў. Але пытаньне пра (як нехта ўжо пісаў) колер сьцягу, што яна ўзьняла на літаратурным Эвэрэсьце сваёй Нобэлеўскай прэміяй, застаецца адкрытым, дыспутаваным яшчэ, пэўна, доўгі час. І, зрэшты, гэта добра. Кожная спрэчка і кантравэрсія вакол беларускасьці, беларускай мовы – лепей за фатальнае маўчаньне.

Віталь ЗАЙКА

Эпоха таксама

заканчэньне з бачыны 1

лікт. Савецкі чалавек, які выказвае недавер аўтарытарызму, але сваёй паставай і заявамі цэмэнтуе яго ў галовах сучасьнікаў. Захвальвае дэмакратычны Захад, але, нягледзячы на неабмежаваныя магчымасьці выбару месца пражываньня, працягвае жыць у “апошняй дыктатуры Эўропы”. Адносіць сябе таксама і да “рускага сьвету”, але адмаўляе грамадзянства ў гэтым сьвеце Сталіну і Пуціну. Кагнітыўны дысананс, такая шматвэктарная, нерэгулярная пастава бывае толькі ў людзей, якія працягваюць мысліць катэгорыямі дапостмадэрнісцкага сьвету, бо тыя, што кумекаюць па-новаму, або ня мысьляць наогул, цалкам з такой карцінай сьвету салідарныя.

Для самой беларускай культуры навіны ня вельмі добрыя. У нейкім сэньсе ствараецца прэцыдэнт – адбываецца яшчэ раней запачаткаваны працэс вымываньня беларускага ў беларускім. Беларуская літаратура на расейскай мове ўваходзіць у школьную праграму не ўпершыню, але да рангу нечага сур’ёзнага ўздымаецца толькі цяпер. Гаворка ж тут не пра абы каго, а пра Нобэлеўскага лаўрэата! Пакуль гэта толькі ўбіты клін, але ў пэрспэктыве часу беларускамоўная літаратура будзе выштурхоўвацца на задворкі. Безумоўна, яна таксама застанецца беларускай, але ці ў выніку зойме фармальную пазыцыю ірляндзкай мовы ў ірляндзкай літаратуры залежыць толькі ад таго, як беларускую мову і культуру будуць працягваць дэфініяваць самыя беларусы. Прычым ня ўсе “таксама беларусы”, а менавіта носьбіты гэтай культуры. Ніякае дэфініяваньне звонку ня будзе мець такога значэньня і сілы як дэфіянаваньне знутры. Застаецца спадзявацца, што калі перажылі Другую сусьветную вайну, Чарнобыль і іншае, то перажывем таксама і гэта.

Віталь ВОРАНАЎ

Лістападаўскі сход

заканчэньне з бачыны 2

касьці, як “Памяць пра леганды”, па-расейску. Але ў рэшце рэшт ён пераканаўся, што лягічным і неабходным крокам ёсьць пераход на беларускую мову.

Сп. Дмітро Палій адзначыў, што дзеля самастойнай будучыні трэба абапірацца на сябе і аддаляцца ад так званага “рускага міру”. Сп-ня Ільліна адзначыла, што менавіта той агрэсіўны і неталерантны “рускі мір”, які зьяўляецца ворагам і самых расейцаў, выкрыла Алексіевіч. І таму гэта натуральным чынам падводзіць яе да ўспрыняцьця ўласнай беларускасьці, да якой яна ўжо зрабіла шэраг крокаў. “Дарэчы, мы, беларусы, вельмі лёгка аддаем усё іншым. Сьвятлана Алексіевіч нашая, і трэба недвухсэнсоўна заявіць пра гэта”.

Падсумаваньнем дыскусіі стала прызнаньне таго, што Сьвятлана Алексіевіч ёсьць сапраўды беларукая пісьменьніца, а яе творчасьць – гэта частка беларускіх культурніцкіх здабыткаў, і таму яе Нобэль – гэта сапраўдны беларускі Нобэль.

Затым сябры “Пагоні” і госьці маглі працягнуць дыскусію, знаёміцца і калегавацца пры віне і пачастунках.

Віталь ЗАЙКА

“Бацькаўшчына” абвяшчае конкурс працаў

Сёлета 10 верасьня Згуртаваньню беларусаў сьвету “Бацькаўшчына” споўнілася 25 гадоў. Чвэрць стагодзьдзя Згуртаваньне працуе дзеля кансалідацыі беларусаў незалежна ад месца пражываньня на грунье любові да нашай супольнай гісторыі, культуры, роднай мовы. Дасягненьні беларусаў замежжа — неад’емная частка нашай супольнай гісторыі й сучаснасьці, нашай культуры. Яны вартыя вывучэньня й папулярызацыі. Справы й творы народжаных у Беларусі мастакоў, пісьменьнікаў, кампазытараў, палітыкаў, грамадзкіх дзеячаў ды звычайных беларусаў ва ўсе часы ўплывалі й працягваюць уплываць на фармаваньне ўяўленьняў пра беларускую нацыю ў сьвеце. А што самі жыхары сёньняшняй Беларусі ведаюць пра нашых замежных суайчыньнікаў?

Каб разумець, якімі праз суродзічаў за мяжой нас бачыць сьвет, і з нагоды свайго юбілею Згуртаваньне “Бацькаўшчына” абвяшчае конкурс працаў, прысьвечаных гісторыі й сучаснасьці беларускага замежжа.

Да разгляду прымаюцца арыгінальныя аўтарскія тэксты навуковага, навукова-папулярнага, публіцыстычнага характару. Яны могуць быць прысьвечаныя розным аспэктам жыцьця й дзейнасьці беларусаў у замежжы, у тым ліку:

- біяграфіям пісьменьнікаў, мастакоў, кампазытараў, палітыкаў, грамадзкіх і іншых дзеячаў, чыё жыцьцё і творчасьць зьвязаныя з замежжам;
- асэнсаваньню творчай спадчыны дзеячаў беларускага замежжа;
- гісторыі масавых эміграцый, перасяленьняў беларусаў па-за межы Беларусі;
- гісторыі або сучаснасьці беларускай прысутнасьці ў асобнай краіне;
- дзейнасьці беларускіх дзяржаўных прадстаўніцтваў на Захадзе: Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, Беларускай Цэнтральнай Рады;
- дзейнасьці асобных беларускіх арганізацыяў, суполак, калектываў, сродкаў масавай інфармацыі;
- сацыяльным, эканамічным, культурным аспэктам існаваньня беларускага замежжа.

У склад <u>журы конкурсу</u> ўваходзяць сябры Рады МГА “ЗБС “Бацькаўшчына”:

- **Натальля Гардзіенка**, гісторык, намесьнік дырэктара БДАМЛМ;
- **Лявон Юрэвіч**, архівіст Ньюёрскай публічнай бібліятэкі;
- **др. Вітаўт Кіпель**, старшыня БІНіМу;
- **др. Янка Запруднік**, сябра ўправы БІНіМу;
- **Валеры Герасімаў**, загадчык аддзелу старадрукаў і рэдкіх выданьняў Прэзыдэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, намесьнік старшыні Рады МГА “ЗБС “Бацькаўшчына”.

Да ўдзелу запрашаюцца як прафэсійныя навукоўцы, гэтак і аматары, як сталыя даследчыкі, гэтак і пачаткоўцы зь Беларусі й замежжа. Тэксты павінны быць раней не публікаваныя й напісаныя на беларускай мове.

Па выніках конкурсу пераможцы атрымаюць каштоўныя ўзнагароды, а найлепшыя працы ўдзельнікаў будуць апублікаваныя.

Памер тэкстаў да 1 аўтарскага аркуша (каля 40 тысячаў знакаў).

Дасылаць працы трэба ў электронным выглядзе з пазнакай “На конкурс” на адрас: *zbsb.minsk@gmail.com* да **1 студзеня 2016 г.**

Інфармацыйны цэнтр МГА “ЗБС “Бацькаўшчына”

Шаноўныя сябры! Рэдакцыя бюлетэня *“Весткі й Паведамленьні”* і кіраўніцтва Згуртаваньня *“Пагоня”* рыхтуюць да друку **каляндар Згуртаваньня “Пагоня” на 2016 год**. Усе падпісчыкі бюлетэня атрымаюць каляндар па пошце разам з наступным студзеньскім нумарам. Калядар будзе надрукаваны вельмі абмежаваным накладам, таму, калі ласка, сваечасова аформіце ці абнавіце падпіскі на *“Весткі й Паведамленьні”*, каб гарантавана атрымаць гэты ўнікальны беларускі каляндар на наступны год.

Уплаты ў Згуртаваньне Ñëàâå³ é àõâÿðàâàíüí³:

- **В. Адамік** 60
- **А. Генюш** 60
- **Я. Курчэўская** 60
- **А. Лабачэўская** 60
- **В. Недагрэенка** 60
- **С. Чарняк** 60

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:
P. O. Box 572
New York, NY 10113
Чэкі выпісвайце на імя скарбніка
Viktar Yedzinovich.

---

*Паважаны **Аляксандар Генюш**, калі ласка, паведаміце рэдакцыі ваш дакладны паштовы адрас.*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

адбудзецца ў суботу **26-га сьнежня 2015 года** на Мангэтане ў Доме Маракоў па адрасу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да прыпынка **Union Square**.*

*Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад **Union Square** па **15-й вуліцы** на скрыжаваньні з **Irving Place**.*

Заля сходаў на 2-м паверсе.

<u>Пачатак</u>: **а 6:00-й** вечара.

Падчас сходу адбудзецца прэзэнтацыя літаратурнага альманаху “БЕЛАРУС” за 2015 год.

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

- **В. Якімовіч** 60
- **Я. Барысевіч** 30
- **В. Бітус** 30
- **А. Генюш** 30
- **Я. Курчэўская** 30
- **А. Лабачэўская** 30
- **І. Мілеўскі** 30
- **С. Чарняк** 30

Шчыры дзякуй!

---

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*

Marat Klakotski
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі выпісвайце на імя скарбніка “Пагоні” **Viktar Yedzinovich**.*

*Падпіску таксама можна аформіць, наведаўшы ў інтэрнэце старонку **www.e-krama.com***